*Мялешка Юлія Валер'еўна, Мялешка Валерый Уладзіміравіч*

# АРГАНІЗАЦЫЯ ПРОЦІПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ Ў ВЁСЦЫ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 30-х ГАДАХ XX СТАГОДДЗЯ

Чытаючы кнігу аб гістарычным жыцці Мінска аўтараў Шыбекі З.В. і Шыбекі С.Ф., у раздзеле "Супраць вады і агню", нашу ўвагу прыцягнуў адзін фотаздымак. На ім былі сфатаграфаваны члены добраахвотнага пажарнага таварыства г. Мінска ў 1911 годзе. Тады нам здалося, што дзесьці мы ўжо бачылі такі падобны здымак сярод сваіх асабістых старых фатакартак, якія нам засталіся ад нашых прадзедаў.

Так яно і атрымалася. Намі былі знойдзены дзве такія фатакарткі, на якіх таксама была сфатаграфавана добраахвотная пажарная дружына з такімі ж аднолькавымі прыладамі для барацьбы з пажарам, толькі значна меншая па колькасці. На першы погляд, яна сапраўды падобная на тую, з кніжкі, але па сваім гістарычным і палітычным часе датавалася прыкладна на 20 гадоў пазней – 1933 г.

У гэты час у Мінску ўжо прайшоў Усебеларускі злёт калгаснікаў-ударнікаў, адбылося адкрыццё Беларускага Дзяржаўнага вялікага тэатра оперы і балета і іншыя падзеі, характэрныя для савецкага перыяду, але ў той час Заходняя Беларусь, адкуль нашы карані, жыла яшчэ ў складзе Рэчы Паспалітай.
Калі яшчэ была жывая мая прабабуля, яна вельмі часта расказвала пра жыццё, як яна казала, "пры Польшчы". Але тэмы краналіся толькі вучобы ў школе, яе польскага настаўніка Галоўні, сельскагаспадарчай і хатняй працы, характэрнага для таго часу рукадзелля. А тэмы аб членстве ў Польскай дабраахвотнай пажарнай дружыне яе мужа, а нашага прадзядулі, ніколі не ўздымала.
Захацелася больш падрабязна даведацца аб стварэнні і дзеянні менавіта сфатаграфаванай каманды.

Рэпазіторый БГМУ



На жаль, гэтаму здымку ўжо 70 гадоў. І, улічваючы тое, што яе членам ў той час было прыкладна па 20 гадоў, то многіх з іх ужо няма ў жывых. Аднак, аказалася што многія факты з свайго дзяцінства, якія тычацца таксама гэтага здымка, памятае і наш дзядуля, Мароз Мікалай Рыгоравіч.

Па яго падказцы нам ўдалося адшукаць яшчэ аднаго тагачаснага члена каманды. Ён і па цяперашні час жыве ў той жа мясціне, дзе дзейнічала гэтая каманда. Яго прозвішча і імя – Грыб Мікалай Васільявіч, 1915 г.н. На здымку № 4 ён сядзіць трэці злева.

Рэпазіторый



Разам яны паведамілі нам ў гутарцы шмат цікавага. Яны расказалі, што пасярод вёскі Вялікая Слабада (зараз таксама вёска Вялікая Слабада, Карэліцкі раён, Гродзенская вобл.) было пабудавана пажарнае дэпо. Гэта быў драўляны хлеў прыкладна 25-30 метраў у даўжыню і 10 метраў у шырыню. У гэтым будынку знаходзіліся ўсе неабходныя прылады для тушэння полымя: вялікія бочкі з вадою на двух калёсах з аглоблямі для ўпражкі каня, ручныя помпы ў асноўным замежнай вытворчасці (амерыканскія, англійскія, польскія), кіркі, лапаты, вёдры, лесвіцы. Музычны горн для падачы сігналу аб пажары знаходзіўся ў майго прадзядулі. Ён быў трубачом.

У тыя гады лета было вельмі гарачае. Хаты будаваліся з дрэва, а дахі пакрываліся саломаю, а раз недалёка ад вёсак знаходзіліся лясы, то вельмі часта ўзнікалі пажары. Улічваючы гэтыя фактары, было прынята рашэнне аб стварэнні ў кожнай гміне добраахвотнай пажарнай каманды з маладых хлопцаў і мужчын. Акрамя гэтага, жыхар кожнай хаты павінен быў мець спецыяльны бусак (багор) для дапамогі пры пажарах. Ён вісеў заўсёды пад страхой хаты і ўжываўся для расцягвання пылаючага будынка. Акрамя гэтага, ва ўсіх жыхароў у вёсцы таксама знаходзіліся вёдры, сякеры, лапаты знаходзіліся у адным і тым жа месцы, у сенцах. Коміны ў вясковых хатах былі ўзняты над страхою і зроблены з дошак. Той з жыхароў, хто быў багацейшы, мог купіць гліняную трубу і ўставіць яе ў дашчаты комін, бо гэта было больш бяспечна. Усе коміны абавязкова павінны былі быць пафарбаваны вапнай у белы колер: гэта давала магчымасць бачыць з зямлі, у каго комін быў закопчаны. За гэтым строга сачыў пастарункова (участковы), які мог за гэта парушэнне саставіць пратакол на пакаранне. Таксама сачылі за гэтым і пажарнікі.




На ўзгорках будаваліся вышкі (маякі), на якіх неслі варту пажарнікі (пазней, у часы вайны, яны былі разбураны, але іх рэшткі можна сустрэць у лесе і ў наш час). Непадалёку ад царквы вёскі Вялікая Слабада таксама быў пабудаваны маяк, на якім знаходзіўся змайстраваны флюгер. Флюгер паказваў напрамак ветру, і пажарнікі маглі ведаць, з якога боку тушыць полымя.
За кожным членам каманды быў замацаваны конь, і ў час пажару кожны з іх павінен быў браць толькі свайго і на выпадак пажару ведаць, што рабіць у гэты момант. Члены гэтай каманды мелі сваё абмундзіраванне. Але, па ўспамінах Грыба Мікалая Васільявіча, форма ім бясплатна не выдавалася. Яны самі павінны былі зарабіць грошы на яе. Гэта адбывалася наступным чынам. Пажарная каманда мела сваю мастацкую самадзейнасць, куды ўваходзілі маладыя хлопцы і дзяўчаты з вёскі, а таксама і члены з пажарнай стражы. Аб гэтым сведчыць яшчэ адзін фотаздымак (3) насценнай газеты 1938 года, дзе якраз яны і сфатаграфаваны. На ёй подпіс: “Коло артыстаў аматараў пры О.С.П. у Вялікай Слабадзе. На доўгую памятку. 1938 году. 14.Х”. Пад кожным фотаздымкам удзельніка подпіс яго прозвішча і імя. Сярод іх лічацца: Печко Зося, Печко Волька, Хілімон Янка, Чачотка Вечык, Грыб Коля, Грыб Зіна, Карп Янка і інш.
Пасярэдзіне дэпо знаходзілася вялікая сцэна. На ёй у вольны час гэтымі аматарамі ставіліся тэатральныя пастаноўкі, праводзіліся танцавальныя вечары. Грошы, атрыманыя за мерапрыемствы, і пералічваліся на абмундзіраванне.



Калі ўважліва паглядзець на фотаздымкі 2 і 4, можна гэтае абмундзіраванне разгледзець. Яно было вельмі прыгожае: цёмнага колеру чатырохкутная фуражка-рагатка з эмблемаю, скураныя боты, порткі-галіфэ і фрэнч (кіцель). На першым плане здымка стаіць пажарная ручная помпа (на жаль, не відаць якой фірмы) з доўгімі шлангамі. За поясам, ці ў руках кожны трымае кірку, якая была неабходным атрыбутам і служыла для розных мэтаў: падчэплівання і расцягвання, разбівання, замацавання і г.д. Таксама бачым музычны горн. Па ўспамінах нашай бабулі, яе бацька, а наш прадзядуля, вельмі прыгожа трубіў у горн, і ёй з астатнімі дзецьмі вёскі гэта вельмі падабалася. Пазней, пасля вайны, як памятае бабуля, гэты горн быў перададзены ў мясцовую школу піянерам.

Самае цікавае з усёй сабранай намі інфармацыі – гэта знойдзеная "легітымацыя"1 нашага прадзядулі. Яна вельмі незвычайная тым, што замест фатакарткі яе ўладальніка ўбірае ў сябе чырвоны адбітак яго вялікага пальца (5). На яе вокладцы (4) размешчаны герб пажарнікаў і, калі перакласці з польскай мовы, то чытаецца прыкладна так:

"Саюз стражы пажарных Рэчы Паспалітай Польскай Навагрудскі округ Ваяводскі Аддзел Павятовы ў Стоўбцах".

Ніжэй за герб чытаем: "Легітымацыя № 19" членства добраахвотнай стражы пажарнай у Велькай Слабадзе (так называецца вёска і па цяперашні час).

На разгортцы дадзенай легітымацыі бачым адбітак вялікага пальца ў рамцы і пад ім подпіс нашага прадзядулі, які старанна літарамі на польскай мове вывеў сваё прозвішча і імя: Kurasz Bazyl – Кураш Базыль (па-беларуску гэта – Кураш Васіль). Пад гэтым подпісам даецца "Увага", якая гаворыць аб тым, што ў выпадку выхаду са стражы гэту легітымацыю неабходна незатрымальна здаць камандуючаму стражай. Справа даецца пацверджанне аб сапраўднасці членства ў дружыне, аб спецыяльным навучанні і праве нашэння абмундзіравання і

знаку гэтага пажарнага саюзу. У канцы пастаўлена чырвоная пячатка з выявамі першых неабходных прыладаў пажарных, подпіс начальніка і, мабыць, сакратара, а таксама тэрмін, па які сапраўдна дадзеная легітымацыя (гэта 31 снежня 1938 г.). На апошняй старонцы разлінаваныя графы для працягу тэрмінаў на наступны перыяд.

Пажарная каманда дзейнічала да пачатку вайны 1941 г.

У вайну, у часы бамбёжак, гарэла ўсё: не толькі асобныя хаты, а цэлая вёска Вялікая Слабада. Гарэлі і ўсе прылягаючыя вёскі: Тарасавічы, Вялетава, Рап’ёва і г.д. Члены каманды ў гэты час знаходзіліся на фронце. Таму тых ваенных пажараў не было магчымасці і не было каму затушыць.

Пасля вайны сталі будавацца калгасы. Супрацьпажарная ахова атрымала спецыяльную тэхніку, і адпала патрэба ва ўсім тым, што было сказана раней.

З усяго вышэйсказанага можна зрабіць вынік, што ў які б час, у якой бы мясціне і пры якім строі не жылі б сумесна людзі, першая задача іх у тым, каб зрабіць перш-наперш бяспечным сваё жыццё, жыццё сваіх блізкіх, хатняй гаспадаркі, каб талакою дапамагаць адзін аднаму ў цяжкіх выпадках, здарэннях, стыхіях прыроды і сумеснымі намаганнямі заўжды пераадольваць іх. Таму, калі ў каго-небудзь здараўся пажар (часцей за ўсё ад травеньскіх маланак, якія траплялі ў саломенныя дахі хат і хлявоў), то ўсе, і старыя, і маладыя, беглі хто з чым, тушыць пажар. Жыхар-пагарэлец быў не адзін: уся вёска ці сяло дапамагалі яму. Разам ездзілі ў лес па дрэва на хату, збіралі салому на страху. На некаторы час, да аднаўлення гаспадаркі, яго карову, каня і свіней забіраў сусед. Здаралася гэта часта, але чалавек не быў пакінуты людзьмі. Таксама ён атрымліваў страхоўку ад дзяржавы. Паколькі радыё ў той час яшчэ не было, то навіны пра пагарэльцаў вусна вельмі хутка распаўсюджваліся нават на вялікія адлегласці. Таму матэрыяльная падтрымка аказвалася ад аднавяскоўцаў, сялян не толькі з прылягаючых, але і вельмі далёкіх вёсак і сёлаў.

Таксама дадзеную арганізаваную добраахвотную дружыну таго часу можна разглядаць як далёкага продка сучасных пажарных каманд і каманд МНС.

Рэпазіторый БГПУ